# ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ЎРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ АРГАНІЗАЦЫЮ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ У КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАЛЕКТЫЎНА-РАЗМЕРКАВАЛЬНАЙ ФОРМЕ

*Бурко Наталля Ягораўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле апісваецца вопыт арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы ў камунікатыўнай калектыўна-размеркавальнай форме. У аснове гэтай формы ляжыць дыферэнцыраваны падыход, які прадугледжвае інклюзіўнасць навучання праз аб'яднанне вучняў у групы ці пары ў адпаведнасці з іх адукацыйнымі запатрабаваннямі. Такі падыход дазваляе зрабіць урок больш эфектыўным як для настаўніка, так і для вучня: педагогу прадастаўляецца магчымасць рэалізаваць пастаўленыя задачы ў поўнай меры, а вучню — апынуцца ў сітуацыі поспеху, калі ён можа выканаць прапанаваныя заданні. Заданні, якія павінны выканаць вучні на ўроку, з'яўляюцца рознаўзроўневымі.*

Як зрабіць урок эфектыўным і які ўрок лічыць эфектыўным? Такія пытанні не адзін раз задаваў сабе кожны настаўнік. Улічваючы ўсе патрабаванні да сучаснага ўрока, прыходзіш да высновы, што эфектыўным будзе той вучэбны занятак, які праходзіць у супрацоўніцтве. Прычым гэтае супрацоўніцтва — сумесная, калектыўная дзейнасць — працуе не толькі ў накірунку настаўнік-вучань, але і ў накірунку вучань–вучань. Л.С. Выгоцкі адзначаў: “Тое, што сёння дзіця можа зрабіць у супрацоўніцтве і пад кіраўніцтвам, заўтра ён здольны зрабіць самастойна...” [1].

Прыдатнай для арганізацыі сумеснай вучэбнай дзейнасці вучняў з'яўляецца камунікатыўная калектыўна-размеркавальная форма. У аснове гэтай формы ляжыць дыферэнцыраваны падыход. Камунікатыўная калектыўна-размеркавальная форма арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў прадугледжвае працу ў парах пастаяннага і зменнага саставу, групавую і індывідуальную працу. Найбольш эфектыўнай з'яўляецца праца ў групах.

На аснове псіхалагічных методык і ацэнкі здольнасцяў вучняў клас размяркоўваюцца на тры групы — “А”, “В” і “С”. У групу “А” ўваходзяць вучні са здавальняючым і сярэднім узроўнем авалодання ведамі, уменнямі і навыкамі; у групу “В” – з сярэднім і дастатковым узроўнем авалодання ведамі, уменнямі і навыкамі; у групу “С” — з дастатковым і высокім узроўнем. Колькасць удзельнікаў групы вызначаецца ў залежнасці ад колькасці вучняў у класе і ўзроўню іх падрыхтаванасці.

Кожнаму ўдзельніку групы ставяцца міні-задачы па выкананні пэўнага задання. Так адбываецца працэс сумеснай дзейнасці, у час якой вучні “раскрываюцца”, бо кожны адказвае за выкананне свайго задання.

Напрыклад, тэарэтычны матэрыял вучні спачатку вывучаюць індывідуальна або ў парах, а потым мяняюцца ў межах пары ці ў пары выходзяць на ўсю групу са сваім выкананым заданнем, абмяркоўваючы пытанні ўжо ў межах сваёй групы (“А” ці “В”). Такое вывучэнне адбываецца пад кантролем настаўніка. Вучні ж групы “С”, выканаўшы свае заданні, выходзяць з імі да ўсяго класа. На гэтым этапе абагульняецца вопыт усіх груп. Такім чынам адбываецца вывучэнне новага матэрыялу ў супрацоўніцтве. Зразумела, што настаўнік пастаянна кантралюе працэс навучання, каменціруе адказы, выпраўляе памылкі ў адказах вучняў, дае неабходныя тлумачэнні.

Трэба адзначыць, што не кожны тэарэтычны матэрыял вучні могуць вывучыць самастойна. У такім выпадку больш складаная частка матэрыялу тлумачыцца настаўнікам, а вучні ў парах і групах вывучаюць і разбіраюць тую частку, да якой ужо першапачатковыя паясненні дадзены настаўніка.

Практычная праца над канкрэтным моўным матэрыялам ажыццяўляецца праз дыферэнцыраваныя заданні, распрацаваныя для кожнай групы. Гэтыя заданні розныя па ступені складанасці, адпавядаюць пэўнаму ўзроўню авалодання вучнямі ведамі, уменнямі і навыкамі.

Заданні складаюцца такім чынам, каб усе аспекты пэўнага вучэбнага матэрыялу ў іх закраналіся і вырашаліся. Розніца заключаецца толькі ў ступені складанасці, напрыклад, дыферэнцыраваныя заданні для працы ў групах на ўроку беларускай мовы ў VII класе па тэме “**Прыслоўе як часціна мовы**” (Дадатак).

Першае заданне *(Прачытайце рады аднакаранёвых слоў. У кожным радзе знайдзіце і выпішыце прыслоўі)* у групах “А” і “В” накіравана на распазнаванне прыслоўяў сярод іншых аднакаранёвых слоў. Вучням першай групы прапануецца эталон, па якім яны могуць сябе праверыць. Пры ўзнікненні спрэчных пытанняў на дапамогу прыходзіць настаўнік.

Вучні з групы “С” ужо ў першым заданні *(Прачытайце тэкст. Вызначце асноўную думку. Дайце загаловак. Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце. Выпішыце па 3 словазлучэнні, у якіх прыслоўі абазначаюць прымету дзеяння, а потым — прымету прыметы)* рашаюць больш шырокае кола вучэбных задач, якія патрабуюць глыбокага разумення тэарэтычнага матэрыялу і творчага падыходу.

Другое заданне ў групах “А” і “В” накіравана на замацаванне ўмення ставіць пытанні да прыслоўяў, а значыць, спрыяе разуменню іх сэнсу і сінтаксічнай функцыі ў сказе. Група “А” ў дапамогу атрымлівае даведку. Заданне для групы “В” ускладняецца тым, што трэба скласці яшчэ і сказы.

Група “С” у другім заданні пераходзіць да асэнсавання сінтаксічнай функцыі прыслоўяў, што прадугледжвае ўменне правільна ставіць пытанне. Заданне ўскладняецца пунктуацыйнымі задачамі.

У трэцім заданні вучні першых дзвюх груп працуюць над сінтаксічнай роляй прыслоўяў у сказах, а вучні групы “С” пераходзяць да творчага задання па складанні міні-тэкстаў.

Работа ў групах арганізуецца так, каб кожны вучань мог усвядоміць важнасць сваёй асобы на ўроку, адчуць поспех ад правільна выкананага задання (няхай нават і не самага складанага), калі “навучае” аднакласнікаў таму матэрыялу, які быў вызначаны менавіта для яго. Камунікатыўная калектыўна-размеркавальная форма пазнавальнай дзейнасці садзейнічае лепшаму разуменню і засваенню вучэбнага матэрыялу, спрыяе стварэнню станоўчага мікраклімату на ўроку, садзейнічае павышэнню прадуктыўнасці ўрока. Вучні прызвычайваюцца да больш высокага тэмпу працы на ўроку, шукаюць найбольш эфектыўныя спосабы для рашэння той ці іншай вучэбнай задачы, бо ведаюць пра выкананне пэўнай колькасці заданняў і валодаюць крытэрыямі ацэньвання. Лідар групы размяркоўвае заданні паміж удзельнікамі, улічваючы іх пажаданні. Некаторыя заданні патрабуюць калектыўнага выканання, а некаторыя індывідуальнага, вынік працы ўсёй групы паведамляецца класу, ладзіцца абмеркаванне. Кожны з удзельнікаў разумее, што ён працуе не толькі на сябе, але і на ўсю групу.

Перад вучнямі з высокай матывацыяй (група “С”) ставіцца больш складаная задача. Ім даводзіцца выконваць заданні павышанай складанасці, у тым ліку творчага і даследчага характару. Іншы раз гэтым вучням прапануецца папрацаваць з больш слабымі вучнямі, для якіх вучні з групы “С” становяцца настаўнікамі, індывідуальнымі кансультантамі.

На этапе падагульнення ведаў вучням прапануюцца пытанні рознай ступені складанасці. Прычым пытанні задаюцца не толькі настаўнікам, а і самімі вучнямі. Адказы на іх даюць таксама вучні. Настаўнік кантралюе працэс дыскусіі, сочыць, каб пытанні былі карэктнымі, правільна сфармуляванымі. Пры неабходнасці карэкціруе, удакладняе змест пытання.

Кантроль ведаў ажыццяўляецца ў рознай форме з выкарыстаннем рознаўзроўневых заданняў.

Дамашняе заданне таксама вызначаецца дыферэнцыраваным характарам: вучням даецца магчымасць выбраць заданне самастойна, абапіраючыся на дасягнутыя вучэбныя вынікі.

Арганізуючы вучэбную дзейнасць вучняў у камунікатыўнай калектыўна-размеркавальнай форме, настаўнік рашае вельмі важныя адукацыйныя задачы: ён не транслюе веды, а вучыць дзяцей гэтыя веды здабываць самім, а таксама прымяняць іх на практыцы і ацэньваць сваю працу на ўроку і працу аднакласнікаў як удзельнікаў адной групы, аднаго цэлага — у супрацоўніцтве. Адзначым, што групавая форма арганізацыі вучэбнай дзейнасці валодае вялікім выхаваўчым патэнцыялам: назіраецца станоўчая дынаміка ў фарміраванні асобасных кампетэнцый вучняў — пачуцця калектывізму, таварыскасці, адказнасці перад аднакласнікамі, а таксама ўмення самаацэнкі і ацэнкі іншых, якое забяспечвае паспяховы працэс сацыялізацыі.

Зразумела, што пры планаванні і правядзенні ўрокаў з элементамі сумеснага навучання неабходна ўлічваць псіхолага-педагагічныя асаблівасці выкладання вучэбнага прадмета, магчымасці адукацыйнага асяроддзя школы і класа, індывідуальныя запыты і здольнасці вучняў. Камунікатыўная калектыўна-размеркавальная форма вучэбнага ўзаемадзеяння дазваляе дасягнуць аптымальнага адукацыйнага выніку, калі кожны вучань працуе плённа і актыўна, а таксама прадстаўляе сабой якасны спосаб фарміравання навыкаў самапазнання і самаацэнкі. Вучні могуць паглядзець на сябе па-іншаму, а настаўнік — “адкрыць” многіх вучняў, убачыць іх рэальныя здольнасці, прабелы ў навучанні беларускай мове і вызначыць шляхі ўдасканалення моўнай кампетэнцыі вучняў.

## Спіс літаратуры


1. Выготский, Л.С. Собрание сочинений в 6-ти томах. Т.3. Проблемы развития психики. [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.psychology-online.net/articles/doc-1865.html. — Дата доступа: 12.12.2022.
2. Петушкова, Е.В. Коммуникативно-деятельностный подход к управлению индивидуальной учебной деятельностью учащихся / Е.В. Петушкова, С.Д. Шакура // Народная асвета. — 2011. — № 2. — С. 7–12.
3. Шакура, С.Д. Использование коллективного способа обучения при формировании умения учиться : учеб.-метод. пособие / С.Д. Шакура ; Акад. последиплом. образования. — Минск, 2004. — 28 с.
4. Шакура, С.Д. Обучение во взаимодействии: учеб.-метод.пособие / С.Д. Шакура. — Минск: АПО, 2017. — 79 с.


*Дата поступления в редакцию: 15.12.2022*

Дадатак

**Прыслоўе як часціна мовы** (VII клас).
Заданні для груп

**ГРУПА “А”**

Тэорыя

Вучні вывучаюць тэарэтычны матэрыял па падручніку пад кантролем настаўніка.

1. Адзначце правільныя сцверджанні.
1) Прыслоўе — самастойная часціна мовы.
2) Прыслоўе — службовая часціна мовы.
3) Прыслоўе — асобая форма дзеяслова.
4) Прыслоўе абазначае прымету дзеяння.
5) Прыслоўе абазначае прымету іншай прыметы.
6) Прыслоўі змяняюцца па склонах.
7) Прыслоўі не скланяюцца і не спрагаюцца.

Практыка

1. Прачытайце рады аднакаранёвых слоў. У кожным радзе знайдзіце і выпішыце прыслоўі.

1. Цішыня, ціхі, ціха, сцішыцца, паціху, ціхусенькі, ціхенечка, сціхаючы.

2. Тройка, тры, трое, утрох, тройчы, тройня, трэцяя, патроіць.

2. Запішыце словазлучэнні. Пастаўце пытанні да прыслоўяў.

Гаварыць спакойна, крыху зрабіў, стаяла побач, цалкам адрамантаваны, прыехаць дадому, сказаў хлопец злева, далятала зблізку, зрабіць наперакор, бачыліся пазаўчора, спрасонку не зразумеў.

ДАВЕДКА: *як? дзе? куды? які? калі? у якой ступені? адкуль? па якой прычыне?*

3. Запішыце сказы. Падкрэсліце прыслоўі як члены сказа.

1. Выступалі цёмна-сінія сцены высокіх лясоў, прыгожа раскіданых па бясконцых прасторах зямлі. 2. Моцныя дубовыя дошкі збіты ўпрытык. 3. Седзячы на галінцы, працяжна пасвістаў шпак. 4. Угары чуўся спеў жаваранка.

**ГРУПА "В"**

Тэорыя

Вучні самастойна вывучаюць тэарэтычны матэрыял па падручніку. Пры неабходнасці можна звярнуцца па дапамогу настаўніка або вучняў з групы "С".

1. Адзначце правільныя сцверджанні.

1) Прыслоўе – самастойная часціна мовы.
2) Прыслоўе – службовая часціна мовы.
3) Прыслоўе – асобая форма дзеяслова.
4) Прыслоўе абазначае прымету дзеяння.
5) Прыслоўе абазначае прымету іншай прыметы.
6) Прыслоўе абазначае прымету па дзеянні.
7) Прыслоўе абазначае прымету прадмета.
8) Прыслоўе абазначае дадатковае дзеянне.
9) Прыслоўі змяняюцца па склонах.
10) Прыслоўі не маюць роду і ліку.
11) Прыслоўі спрагаюцца.
12) Прыслоўі не скланяюцца і не спрагаюцца.
13) Прыслоўі маюць нулявы канчатак.

Практыка

1. Прачытайце рады аднакаранёвых слоў. У кожным радзе знайдзіце і выпішыце прыслоўі.

1. Цішыня, ціхі, ціха, сцішыцца, паціху, ціхусенькі, ціхенечка, сціхаючы.

2. Тройка, тры, трое, утрох, тройчы, тройня, трэцяя, патроіць.

3. Людны, людскі, па-людску, абязлюдзець, людзі, людна.

2. Запішыце словазлучэнні. Пастаўце пытанні да прыслоўяў. З двума словазлучэннямі складзіце і запішыце сказы.

Гаварыць спакойна, крыху зрабіў, стаяла побач, цалкам адрамантаваны, прыехаць дадому, сказаў хлопец злева, далятала зблізку, зрабіць наперакор, бачыліся пазаўчора, спрасонку не зразумеў.

3. Запішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце прыслоўі як члены сказа.

1. Дарога шчыльна зарослая травой падымалася ўгару. 2. Цёмна-ліловая хмара глуха вуркоча і цягнецца да сонца. 3. У доме насупраць жыве мой сябар. 4. Вазы даверху нагружаны жытам.

**ГРУПА "С"**

Тэорыя

Вучні вывучаюць тэарэтычны матэрыял па падручніку пад кантролем настаўніка.

1. Адзначце правільныя сцверджанні.

1) Прыслоўе – самастойная часціна мовы.
2) Прыслоўе – службовая часціна мовы.
3) Прыслоўе – асобая форма дзеяслова.
4) Прыслоўе абазначае прымету дзеяння.
5) Прыслоўе абазначае прымету іншай прыметы.
6) Прыслоўе абазначае прымету па дзеянні.
7) Прыслоўе абазначае прымету прадмета.
8) Прыслоўе абазначае дадатковае дзеянне.
9) Прыслоўі змяняюцца па склонах.
10) Прыслоўі не маюць роду і ліку.
11) Прыслоўі спрагаюцца.
12) Прыслоўі не скланяюцца і не спрагаюцца.
13) Прыслоўі маюць нулявы канчатак.
14) Дакажыце, што выдзеленае слова ў сказе з'яўляецца прыслоўем.

Бялявыя зімовыя хмары нізка навіслі над змярцвелаю зямлёю.

Практыка

1. Прачытайце тэкст. Вызначце асноўную думку. Дайце загаловак. Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце. Выпішыце па 3 словазлучэнні, у якіх прыслоўі абазначаюць прымету дзеяння, а потым – прымету прыметы.

Цікава, што спачатку будучы матэматык і фізік Ісаак Ньютан вучыўся даволі пасрэдна. Дапамог у вучобе адзін цікавы, хоць і не дужа прыемны для самога Ньютана, выпадак.

Неяк на перапынку адзін з вучняў моцна стукнуў яму па жываце. Адказаць тым жа Ісаак не мог, таму што быў значна слабейшы.

І хлопчык знайшоў даволі арыгінальны спосаб помсты. Справа ў тым, што яго крыўдзіцель пераўзыходзіў Ньютана не толькі ў фізічнай сіле, але і быў першым вучнем у класе. І тады будучы вучоны вырашыў перагнаць свайго саперніка па ведах. І, што вы думаеце, праз некалькі месяцаў у вучобе з ім ужо ніхто не мог спаборнічаць.

2. Запішыце сказы, расстаўляючы, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Вызначце сінтаксічную функцыю прыслоўяў.

1. Ад лугавых узгоркаў бязлітасна выпаленых сонцам ужо дыхала сумным настроем восені. 2. Узімку рака мела нейкі чароўны выгляд. 3. Седзячы на галінцы працяжна пасвіствае грак. 4. У доме насупраць жыве мой сябар. 5. У лесе стала весела ад спеваў птушак.

3. Складзіце і запішыце тэкст-мініяцюру на адну з прапанаваных тэм: "Як памяняць лямпачку", "Як прыгатаваць…", "Правілы паводзін на вуліцы", "Як заплесці касу".